Александрына Паршына



Вядучы рэдактар
Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

# Дзень праваслаўнай кнігі

Спачатку было Слова.
І слова было ў Бога. І Слова было – Бог.
*Новы Запавет*

Дзень праваслаўнай кнігі – свята вялікае і надзвычай важнае, асабліва ў наш час імклівага развіцця інфармацыйных тэхналогій, ва ўмовах зніжэння цікавасці да чытання. Стае песімістычных прагнозаў – і пакінуць без увагі першакрыніцу духоўна-маральных каштоўнасцей немагчыма і недаравальна.

Сёлета Дзень праваслаўнай кнігі прымеркаваны да юбілею беларускага кнігадрукавання, бо 500 год таму, у Празе, наш суайчыннік, усходнеславянскі першадрукар Францыск Скарына выдаў Псалтыр, а затым і астатнія кнігі Старога Запавету – «Біблію Руску».

У якасці арганізатараў урачыстага мерапрыемства выступілі тры духоўна-асветніцкія структуры: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Выдавецкі савет Беларускай Праваслаўнай Царквы і Свята-Елісавецінскі жаночы манастыр (Мінск). Плённая сумесная праца – і свята стартавала. 10 сакавіка 2017 г. у НББ сабраліся шматлікія шаноўныя госці: Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел; старшыня Сінадальнага аддзела адукацыі і катэхізацыі Беларускай Праваслаўнай Царквы, епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін; старшыня Выдавецкага савета Беларускай Праваслаўнай Царквы, біскуп Маладзечанскі і Стаўбцоўскі Павел; духавенства Беларускага Экзархата, прадстаўнікі міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі Рэспублікі Беларусь, дыпламатычных місій, абласных і мясцовых выканаўчых органаў улады; навучэнцы духоўных і свецкіх школ, наведвальнікі бібліятэкі і іншыя зацікаўленыя.

Пачалося святкаванне Дня праваслаўнай кнігі з адкрыцця экспазіцыі рэдкіх выданняў Біблії ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Аўдыторы былі

прадстаўлены Святыя Пісанні XV–XX стст. з розных краін: Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі і інш. Сярод старажытных рукапісных і друкаваных асобнікаў, зводаў біблейскіх тэкстаў і іншых унікальных экспанатаў выставы дэманстравалася факсімільнае выданне рукапісу паслання апостала Пятра, датаванага III ст. У цырымоніі адкрыцця ўдзельнічалі Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Сцяпанавіч Матульскі. Дакрануцца да кніжных сведкаў гісторыі беларускага кнігадрукавання можна было на працягу цэлага месяца.

Далей у канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбыўся ўрачысты сход, у пачатку якога з прывітальным словам да прысутных звярнуўся біскуп Маладзечанскі і Стаўбцоўскі Павел. Ён адзначыў, што святкаванне юбілея беларускага кнігадрукавання не толькі дапамагае азнаёміцца з гісторыяй, але і садзейнічае выхаванню моладзі ў любові да кнігі, павагі да нацыянальных традыцый і хрысціянскіх духоўна-маральных каштоўнасцей.

З натхняльнай прадмовай выступіў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел. Па яго словах, праз кнігу нашы продкі пазнавалі Бога, навакольны свет і саміх сябе, вучыліся добраму, вечнаму, светламу. Гэтыя ж функцыі кніга выконвае і сёння. Мітрапаліт Павел выказаў надзею, што дзеці і моладзь Беларусі захаваюць імкненне да кнігі, нягледзячы на вялікую канкурэнцыю з сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Ён падкрэсліў: «Людзі разумелі, што жыццё на зямлі мае для кожнага чалавека пэўны цяжар. А Кніга жыцця апавядала пра вечнасць, пра высокае тварэнне Богам чалавека. Менавіта кніга робіць чалавека Чалавекам. Кожны раз калі мы кранаем яе, адбываецца нешта містычнае... Мы не толькі бачым і чуем, але і хвалюемся за герояў... Кінематограф зрабіў для нас практычна ўсё: сядзі, глядзі і слухай. А калі мы чытаем кнігу, яна спадзвігае на перапрацоўку яе мастацкіх вобразаў. Такім чынам адбываецца ўнутранае развіццё чалавека, гарманічнае пераўтварэнне яго ўнутранага сусвету. Таму кніга вымушае чытача працаваць розумам, прывучае да стараннасці, заклікае любіць Бога, Айчызну, людзей». Мітрапаліт цёпла падзякаваў Р.С. Матульскаму за актыўнае і плённае супрацоўніцтва з Беларускай Праваслаўнай Царквой і блаславіў удзельнікаў імпрэзы.

Падчас сходу былі падведзены і вынікі конкурсаў творчых і даследчых работ навучэнцаў, таксама прымеркаваных да 500-годдзя выдання Бібліі Ф. Скарынам і арганізаваных Інстытутам тэалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дыпломы пераможцам уручыў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Яшчэ адна значная падзея свята – прэзентацыя Р.С. Матульскім факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны» ў 20-ці тамах. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі сцісла распавёў пра гісторыю стварэння праекта: «Калі 10 год назад мы пачалі рыхтавацца да юбілею беларускага кнігадрукавання, перш за ўсё вырашылі даведацца, а дзе ж кнігі Скарыны зараз. Як высветлілася, яны не толькі ў Беларусі і яе бліжэйшых краін-суседак… Кнігі раз'ехаліся па ўсяму свету, пераплылі мора і трапілі ў Англію, перыплылі акіян – апынуліся ў Злучаных Штатах Амерыкі… І тады мы задумаліся аб тым, як гэтыя кнігі вярнуць на Радзіму, як даць магчымасць сучаснікам прачытаць іх. Збіралі па старонцы з усяго свету, год за годам аднаўлялі скарынаўскую спадчыну і сабралі 20 тамоў… Усе друкаваныя кнігі Скарыны, аб'яднаныя ў адну серыю, сталі даступны нашым суайчыннікам і па-за межамі Беларусі». Р.С. Матульскі падкрэсліў: «Тое, што напісана ў Бібліі, – яе запаветы – не састарэла і ніколі не састарэе, колькі б тысячагоддзяў не прайшло. На жаль, за 500 гадоў з моманту выдання гэтых кніг Францыскам Скарынам людзі не сталі лепш. Запаведзі ўсё такія ж актуальныя, як і ў тыя часы. Выдаючы гэту кнігу, мы жадаем нагадаць усім яшчэ раз звярнуцца да біблейскіх запаветаў. Скарына сваю кнігу, мне здаецца па прадмовах і каментарах, адрасаваў у першую чаргу моладзі – тым, хто ўступае ў жыццё, каму неабходны арыентыры. Сёння я хачу сімвалічна перадаць першы том нашага факсімільнага выдання Францыска Скарыны для студэнтаў і слухачоў Мінскай духоўнай акадэміі, каб і надалей славіць Хрыста і жыць па запаведзях».

Завяршылася імпрэза цудоўнай канцэртнай праграмай з удзелам ансамбля скрыпачоў «Сугучча» гімназіі-каледжа мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка (мастацкі кіраўнік Галіна Ганчарова) і дзіцячага харавога калектыву пры нядзельнай школе Свята-Елісавецінскага манастыра (мастацкі кіраўнік Марыя Бахвалова).

Адначасова ў галерэі «Ракурс» працавала выстава кніг беларускіх праваслаўных выдавецтваў, якія прадставілі навінкі дзіцячай літаратуры, духоўна-маральных мастацкіх выданняў, жыццяпісы і творы святых айцоў і настаўнікаў Царквы, катэхізічныя кнігі. Яны дапамагаюць калі не зразумець сэнс жыцця чалавека, то хаця б наблізіць нас да гэтага разумення. Літаратуру, адрасаваную самай рознай аўдыторыі, аб'ядноўвае імкненне захоўваць высокую місію кнігі, пераемнасць пакаленняў, сцвярджэнне традыцыйных маральных якасцей.

Прыцягвала ўвагу і «Литературная беседка» з натхняльнымі музыкальна-паэтычнымі праграмамі для дзяцей і дарослых: «Чему учат сказки: от душевного к духовному» , «Добрые книжки – добрые дела» (Алена Міхаленка, галоўны рэдактар газеты «Воскресение»), «Читаем и поем вместе» (Таццяна Дашкевіч, аўтар-выканаўца). Жадаючых адпачыць вабіла ўтульнае «Літаратурнае кафэ», дзе можна было паласавацца пад кубачак духмянай кавы манастырскім печывам, пагартаць кніжку ці нават сфатаграфавацца на фоне друкаванай машынкі і велізарнага скрутка. Дарэчы кажучы, атрымаць арыгінальны фотаздымак на памяць можна было і каля рэканструяванай спецыяльна для выставы келлі першадрукара з усёй адпаведнай атрыбутыкай.

Маленькія наведвальнікі мелі магчымасць паспрабаваць сябе ў ролі старажытных перапісчыкаў: у «Школе каліграфаў» яны маглі перапісаць стылізаваную пад царкоўнаславянскую мову старонку тэксту – чырвонымі чарнілам і з дапамогай сапраўдных гусіных пер'яў!

Захаванне высокага ўзроўню духоўнай культуры грамадства – справа адказная і даволі цяжкая, бо непазбежна звязана з шэрагам фактараў: сацыяльным, эканамічным, ідэалагічным і інш. Аднак ёсць універсальны сродак дапамогі – невычэрпальная крыніца спрадвечнай мудрасці, нязгаснага святла веры і ведаў, сапраўдны прыклад годнага чалавечага жыцця. Імя ёй – праваслаўная кніга.

Мерапрыемствы накшталт Дня праваслаўнай кнігі ўносяць значны ўклад у падтрымку духоўнай культуры грамадства і папулярызацыю высокаякаснай духоўна-маральнай і мастацкай літаратуры.

**Summary**

The article describes the Day of the Orthodox Book in the National Library of Belarus.